*Акуневіч В.У.*
Віцебскі дзяржаўны універсітэт

## Перыядычны друк Віцебска на пераломе часу: 1917 г.

Гісторыя віцебскага перыядычнага друку ведае часы крызісаў, зацішшаў, узлётаў. Так, да нядаўняга часу ў горадзе выходзіў адзін "Віцебскі рабочы", сёння ж колькасць перыядычных выданняў дасягнула дванаццаці.

Але бадай самым багатым на перыядычныя выданні быў 1917-ы год, год вялікіх узрушэнняў, бурнага палітычнага ўсплеску, што і адбілася на іх колькасці і характары. Як успамінаў адзін з віцебскіх рэвалюцыянераў С.Крылоў: "...Весь город и вся губерния были засыпаны кричащими лозунгами. Стены и заборы города были заклеены газетами, плакатами, жирным шрифтом на прекрасной бумаге напечатанными программами, политическими платформами и т.д." [1]

У гэты час працягвалі выдавацца традыцыйныя афіцыйна-інфармацыйныя і грамадска-палітычныя газеты. Вядома, як бы яны не імкнуліся быць нейтральнымі, на іх адчуваўся адбітак часу. "Витебские губернские ведомости", якія выходзілі з 1838 г. і друкавалі пастановы і распараджэнні цэнтральных і мясцовых улад, у 1917 г. (галоўны рэдактар М.Сталеўскі) змяшчалі пастановы Часовага ўраду і яго гу-

бернскага камісара, а ў сваіх апошніх нумарах — нават пастановы мясцовых органаў Савецкай улады. Усталяванне на пачатку 1918 г. дыктатуры бальшавікоў прывяло да ліквідацыі гэтага выдання.

Штодзённа ў 1917 г. выходзіла прыватная газета “Витебский листок” (выдавалася з 1916 г.) і два яе дадаткі “Вечерний бюллетень Витебского листка” и бясплатная газета “Кабирия”. Рэдактар-выдаўца газет І.Васільеў. На кастрычніцкія падзеі ён адрэагаваў новай назвай газеты — “Новый листок Витебска”, якая выходзіла два месяцы.

З 1912 г. у Віцебску распаўсюджвалася штодзённая грамадска-палітычная газета шавіністычнага накірунку, якая выказвала ідэі “Саюза рускага народу”, “Витебский вестник”. Але ўжо першая рэвалюцыйная хваля змяла ў красавіку 1917 г. гэтае выданне. Не вытрымаў рэвалюцыйнага віхру і ліберальны грамадска-палітычны і літаратурны штотыднёвік “Витебский край” (выдаваўся з 30 кастрычніка 1916 па 22 кастрычніка 1917 г.).

Але найбольшая колькасць перыядычных выданняў выходзіла па ініцыятыве рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху,які ў Віцебску 1917-га меў шырокі спектр. Усплеск грамадскага жыцця, узнікненне шматлікіх партый, аб’яднанняў, рухаў выклікала з’яўленне вялікай колькасці лістовак, пракламацый, газет.

З сакавіка 1917 г. асноўнай перыядычнай трыбунай рэвалюцыйна-дэмакратычных сіл стала газета “Известия Витебского совета солдатских и рабочих депутатов”. Найбольшы ўплыў на яе аказвалі меншавікі і бундаўцы, як дарэчы і ў гарсавеце. Таму тут можна сустрэць даволі змястоўную інфармацыю аб дзейнасці гэтых партый, а таксама Саветаў, шматлікіх прафсаюзных арганізацый, барацьбе працоўных за свае правы, дзейнасці органаў самакіравання і Часовага ўраду. Як газета дэмакратычных традыцый яна друкуе матэрыялы аб дзейнасці бальшавікоў, БСГ, ППС (польскай левіцы), нацыянальна-культурных арганізацый. Кастрычніцкі пераварот і ўсталяванне аднапартыйнай дыктатуры бальшавікоў спынілі выданне газеты. 28 кастрычніка “Известия Витебского Совета...” выйшла з заявай: “Сегодняшний номер Известий выходит под цензурой большевиков” [3], а 14 лістапада была закрыта.

Не скарыўшыся волі лёсу, сацыялістычныя партыі з 16 лістапада пачалі выдаваць газету “Борьба”, як орган сацыялістычнага блока Віцебскага гарадскога самакіравання. Гэта газета была апазіцыйнай усталяваўшамуся пасля кастрычніцкага перавароту парадку. Яе рэдагаваў лідэр Віцебскай арганізацыі Бунд Р.Я.Арансан, адна з са-

мых яркіх фігур Віцебска 1917-га [4]. З ліквідацыяй у студзені 1918 г. гарадской Думы была закрыта і газета "Борьба".

Практычна ўсе ўплывовыя ў горадзе палітычныя сілы намагаліся мець свой друкаваны орган каб весці шырокую прапаганду і агітацыю сярод насельніцтва. Так, у красавіку-маі 1917 г. пад дэвізам "Свобода, равенство, братство" выходзіла штодзённая газета "Свободное слово". Хаця ў падзагалоўку і не ўказвалася на крыніцы выдання, але тое, што ў газеце вялікая ўвага надавалася дзейнасці Віцебскага Сялянскага Саюза, а галоўным яе рэдактарам з'яўляўся У.М.Карпаў, адзін з лідэраў энэсаў, дае падставы лічыць "Свободное слово" органам віцебскага аддзелу трудавой народна-сацыялістычнай партыі. Традыцыі гэтай газеты ў кастрычніку 1917 г. працягвала штодзённая палітычная ранішняя газета "Витебское слово", якая ўжо заявіла аб сабе як органе Віцебскага камітэта Трудавой народна-сацыялістычнай партыі. Рэдагавалі яе Я.П.Алонаў [5] і М.І.Багданаў.

Сялянскае пытанне было цэнтральным і ў газеце "Известия Витебского губернского Совета крестьянских депутатов". Першы яе нумар выйшаў 31 жніўня 1917 г. пад назвай "Бюллетень Витебского губернского Совета крестьянских депутатов". Да 10 кастрычніка выйшла 15 нумароў. Узначальвалі газету Н.С.Асланаў, адзін з лідэраў партыі эсэраў у горадзе, і старшыня Віцебскага сялянскага саюза А.Я.Куссэ-Цюз [6].

Сваё выданне мелі і меншавікі. З 22 мая па 2 лістапада 1917 г. выходзіла "Витебская социал-демократическая газета" як орган Віцебскага камітэта аб'яднанай арганізацыі РСДРП. "Аб'яднанка", у склад якой уваходзілі меншавікі, бундаўцы, латышы-інтэрнацыяналісты і іншыя сацыял-дэмакратычныя групы, была створана ў сакавіку 1917 г. з мэтай згрупавання ўсіх сацыял-дэмакратычных сіл у барацьбе за месцы ў Саветах і гарадской Думе. Нягледзячы на такое шырокае прадстаўніцтва, ідэйна і колькасна тут пераважалі меншавікі. Апошні, вядомы нам, 11-ты нумар газеты выйшаў 2 ліпеня 1917 г., калі латышы-інтэрнацыяналісты разам з бальшавікамі стварылі адну арганізацыю.

У кастрычніку-лістападзе 1917 г. выдавалася газета "Трудовой народ", орган Віцебскага губернскага камітэта партыі эсэраў і Віцебскага губернскага Савета сялянскіх дэпутатаў. Адказнымі рэдактарамі былі С.Лабастаў і В.Лемоніўс. Высветліць палітычны і ідэйны твар, скіраванасць гэтай газеты не прадстаўляецца магчымым, бо вядомы толькі адзіны 14-ты нумар ад 10 лістапада.

У багатым на перыядычныя выданні 1917-м меліся і іншыя: прафесійныя, асветніцкія і г.д. Так, Саюз служачых, масцеравых і рабочых Рыга-Арлоўскай чыгункі выдаваў свае "Известия...", а клуб 326-га палка Пскоўскай дружыны заявіў аб сабе газетай "Наш товарищ".

Аднак жа ўсталяванне дыктатуры партыі бальшавікоў прывяло да знішчэння іх палітычных апанентаў і, як заканамернасць, значнага змяншэння колькасці перыядычных выданняў, дзе запанавалі аднастайныя,безальтэрнатыўныя палітычныя ідэі. З 29 кастрычніка 1917 г. пачаў выходзіць першы орган бальшавіцкай арганізацыі "Известия Военно-революционного комитета г.Витебска" (адказныя рэдактары В.П.Грабенік [7] і Шыгалін), праўобраз газеты "Віцебскі рабочы", адзінага на многія дзесяцігоддзі масавага перыядычнага выдання.

Вывучэнне гісторыі перыядычнага друку паказвае непасрэдную сувязь між палітычнай свабодай, свабодай слова, палітычных партый і г.д., і колькасным і якасным багаццем перыядычнага друку, які з'яўляецца важнай крыніцай вывучэння палітычнай гісторыі. Але гэтая крыніца ў варунках палітычнай барацьбы, а то і проста з-за неахайнасці адказных асоб падпадала пад знішчэнне, што значна збядняе сёння крыніцы даследаванняў. Так, у 1954 г. Віцебскі аблліт загадаў кіраўніцтву Віцебскага абласнога краязнаўчага музея перадаць у сакрэтны фонд дзяржархіва больш за 100 экз. розных лістовак, адозваў і газет, якія адлюстроўвалі вірлівы час рэвалюцый. На сённяшні дзень гэтыя матэрыялы не ўдалося знайсці ні ў водным з архіваў рэспублікі. Для гісторыі застаўся толькі акт перадачы матэрыялаў [8].

## ЛІТАРАТУРА


1. Красная быль. Витебск, 1924. С.110.
2. У 1917 г. у Віцебску дзейнічала больш за 20 палітычных партый і груп: ад агульнавядомых ПСР, Бунд, меншавікоў, трудавікоў і г.д. да яўрэйскіх, беларускіх, польскіх, украінскіх і інш. нацыянальных аб'яднанняў.
3. Известия Витебского Совета солдатских и рабочих депутатов. 1917. 28 октября.
4. Арансан Рыгор Якаўлевіч, адзін з кіраўнікоў Віцебскага Савета салдацкіх і рабочых дэпутатаў, член гарадской Думы, лідэр партыі Бунд. Пасля кастрычніцкіх падзей быў у апазіцыі бальшавіцкай уладзе, арыштоўваўся "ЧК", высланы за межы Віцебскай гу-

берні, а потым і Савецкай Расіі. Жыў у Нью-Йорку, дзе напісаў некалькі кніг аб рэвалюцыі ў Расіі.

5. Алонаў Яўген Піліпавіч (1875-1930), ураджэнец Гарадоцкага павета, выдатны вучоны і грамадскі дзеяч, заснавальнік беларускай ветэрынарыі, першы рэктар Віцебскага ветінстытута, адзін з першых герояў працы ў Віцебску.
6. Куссэ-Цюз Аляксандр Янавіч, старшыня Віцебскага сялянскага саюза, член выканкома Усерасійскага сялянскага саюза, а пазней і яго Беларускага абласнога камітэта, адзін з арганізатараў 1-га Ўсебеларускага кангрэса. Сляды яго губляюцца пасля масавай калектывізацыі ў Ленінградзе.
7. Грабенік Васіль Панцеляймонавіч (1886-1938), землямер у Кіеўскай губерні. З 1914 г. у арміі, служыў у Віцебску. Актыўны ўдзельнік усталявання Савецкай улады ў Віцебску. Член Віцебскіх губкома РКП(б) і губвыканкома. З 1919 г. зноў на Украіне.
8. Віцебскі абласны краязнаўчы музей.